■ Нефармат

ВЫСОКІЯ АДНОСІНЫ

Таццяна не першы раз выбіралася на адпачынак. Справа для яе звыклая. Праўда, часцей яны ездзілі з мужам. Але бывала, калі вырвацца не дазваляла яго работа, адпраўлялася на курорт адна. Чалавек яна камунікабельны, лёгка сыходзіцца з людзьмі. Ды і якія там стасункі: за два-тры тыдні выпадала разам з суседзямі з'ездзіць на экскурсію, разы два павячэраць у адной кампаніі альбо схадзіць на мора, пагрэцца на пляжы. Усё ж весялей, чым удваіх, тым больш адной. Але тыя санаторна-курортныя знаёмствы, іншым разам нават вельмі прыемныя, заканчваліся найчасцей з сезонам адпачынку і гэтак жа хутка забываліся. А гэтым разам...

Ужо больш за год прайшло з той пары, як яна прыехала з санаторыя, галоўнай каштоўнасцю якога лічыцца гаючая мінеральная вада, а суседзяў сваіх успамінае да гэтага часу. Дзве сямейныя пары адразу заваявалі яе сімпатыю. Інтэлігентныя па выглядзе людзі былі яшчэ і аднадумцамі. Яны не проста хадзілі на абед-вячэру, прымалі працэдуры, пілі па графіку лячэбную ваду. Яны прыехалі амаль з гатовым планам адпачынку, які па хадзе падзей карэктавалі. Такім чынам кожны вечар у іх быў заняты. Сябры ладзілі велапаходы, для гэтага бралі напракат веласіпеды, удзельнічалі ў мерапрыемствах санаторыя, вечарам, бывала, адпраўляліся на шашлыкі. У выхадныя дні абавязкова ехалі на экскурсію.

Таццяна міжволі любавалася тым, як людзі ўмеюць змястоўна адпачываць. Сваёй энергіяй яны зараджалі іншых. Дзякуючы ім маладжавая пенсіянерка з Брэстчыны таксама наведала многія славутасці Заходняй Украіны, седзячы каля кастра, успомніла песні свайго студэнцкага юнацтва, з задавальненнем далучалася да дыскусій на тэмы літаратуры, мастацтва, палітыкі. Вечарам па вайберы дзялілася ўражаннямі з мужам. Гаварыла яму, што налета яны абавязкова падбухтораць сваіх прыяцеляў-суседзяў Лёню і Марыну паехаць з імі на адпачынак. І чаму гэта раней не прыходзіла ў галаву? Жывуць побач не адзін дзясятак гадоў, Новы год, дні нараджэння разам адзначаюць, а вось выбрацца куды-небудзь учацвярых не здагадаліся. Муж яе гэтыя разважанні ўспрыняў трохі скептычна: «Вой, Марына свае цяпліцы ды вялікі агарод у сезон не пакіне, Лёніка аднаго яна нікуды не адпусціць, ды ён і наогул не вялікі аматар падарожжаў».

Але як чалавек, што лёгка загараецца новай ідэяй, Таццяна ўсё ж у думках выстройвала планы адпачынку на будучы год. Пры выпадку рашыла распытаць сваіх новых таварышаў па паверсе, ці даўно яны сябруюць. Ёй здалося, што знаёмыя гэтыя людзі з часоў студэнцтва, а то і школы.

— Мы сябруем менш за дзясятак гадоў, — сказала Людміла, жонка душы гэтай кампаніі. — Мы — сваты. Пасябравалі адразу, як пазнаёміліся, з той пары разам стараемся ладзіць адпачынкі. Так весялей, ды і магчымасцяў больш — напрыклад, ажыццявіць тую ж экскурсію невялічкім калектывам абыходзіцца танней, чым дваім. Нанялі машыну і паехалі. Людзі мы небагатыя, у кожнай сям'і адзін з сужэнцаў працуе, другі на пенсіі. Але раз на год дазваляем сабе адпачынак, стараемся час правесці з карысцю.

— Калі вы так сябруеце, значыць, і дзеці вашы жывуць прыгожа, — заўважыла ў адказ Таццяна. — У такім разе можна выязджаць яшчэ большым калектывам.

— Нашы дзеці разведзеныя, — амаль што весела адказала суразмоўніца. — Але ж гэта не нагода нам псаваць свае адносіны.

Далей Людміла расказала, што ў дзяцей, дзякаваць богу, усё наладзілася. Кожны з іх уступіў у шлюб другі раз, і цяпер маладыя сябруюць сем'ямі.

«Вось так бывае, — падсумавала свой аповед суседкам па бальнічнай палаце Таццяна Пятроўна. — А я думала, падобнае толькі ў кіно паказваюць. Перад Новым годам, здаецца, усе каналы пракруцілі старую добрую стужку «Пакроўскія вароты». Там магутная характарам гераіня Маргарыта Паўлаўна так клапоціцца пра былога мужа, што гатовая забраць яго ў новую сям'ю супраць яго волі. Забаўны і смешны сюжэт, прыдуманы аўтарамі... А ў жыцці, аказваецца, усяляк бывае».

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.17	17.24	8.07
Віцебск —	9.13	17.07	7.54
Магілёў —	9.07	17.14	8.07
Гомель —	8.56	17.17	8.21
Гродна —	9.31	17.40	8.09
Брэст —	9.24	17.48	8.24

Месяц

Маладзік 17 студзеня. Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Іосіфа, Рыгора, Яўгеніі.*
К. *Пятра, Хрысціны.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

18 СТУДЗЕНЯ

1664 год — са з'яўленнем у Мінску мноства юрыдык (адміністрацыйна і юрыдычна адасобленых частак горада) граматай караля прадпісана ў Мінску і іншых гарадах жыхарам з ліку рамеснікаў абавязкова ўваходзіць у склад цэхаў.

1855 год — нарадзіўся (в. Карочын, цяпер у Івацэвіцкім раёне) Канстанцін Вікенцьевіч Хруцкі, герой руска-турэцкай вайны (1877—1878). У 1885 годзе скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю. У 1875—1881 гадах служыў у войску, старшы унтэр-афіцэр, удзельнік вызвалення Балгарыі ад турэцкага прыгнёту, у тым ліку штурму крэпасці Плеўна. Вызначыўся пры абароне перавала на Шыпцы. З 1885 года — сельскі настаўнік у Гродзенскай губерні. З 1915-га — у Маскве, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1919 годзе за рэвалюцыйную дзейнасць арыштаваны ў Омску калчакаўцамі і прысуджаны да расстрэлу. Пасля вызвалення Чырвонай Арміяй працаваў у Сібіры, у Новарасійску. Памёр у 1969 годзе.

1882 год — нарадзіўся Іосіф Рыгоравіч Лангбард, архітэктар, заслужаны дзеяч мастацтваў і архітэктуры Беларусі, доктар архітэктуры, прафесар. Адзін з заснавальнікаў савецкай архітэктуры Беларусі. Сярод яго работ у Мінску: Дом урада, Цэнтральны Дом афіцэраў, будынак Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, галоўны корпус НАН Беларусі. Адзін з аўтараў «Эскіза Мінска», планіроўкі і схемы генплана пасляваеннага Гомеля. Памёр у 1951 годзе.

1904 год — нарадзіўся Барыс Андрэевіч Бабачкін, рускі акцёр, рэжысёр, народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай Працы, прафесар. У маладыя гады акцёр працаваў у тэатры ў Магілёве, здымаўся ў беларускіх фільмах «Першы ўзвод», «Двойчы народжаны» і інш. Тройчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

1926 год — адбылася прэм'ера фільма «Браняносец Пацёмкін». Гэта нямы чорна-белы мастацкі фільм, зняты Сяргеем Эйзенштэйнам на кінастудыі «Масфільм» у 1925 годзе. Сцэнарый, па якім здымаўся фільм, заснаваны на рэальных падзеях, што адбыліся ў чэрвені 1905 года, калі на браняносцы «Пацёмкін» каманда ўзняла паўстанне і захапіла карабель. Трыумфальнае шэсце карціны пачалося з кінатэатра «Мастацкі» на Арбаце ў Маскве, які тады называўся «Дзяржаўны электратэатр». Першыя гледачы, якія прыйшлі туды 18 студзеня 1926 года на прэм'еру, былі ўражаны не толькі фільмам, але і прэм'ернай абстаноўкай. Увесь службовы персанал, ад білецёраў да кінамеханіка, быў апрануты ў марскую форму, а фасад кінатэатра нагадваў вялікую мадэль ваеннага карабля. Прэм'ера адбылася дзякуючы актыўнай пазіцыі вядучых дзеячаў савецкага авангарду, сярод якіх быў і У. Маякоўскі. Фільм быў з захапленнем прыняты на пасяджэнні кінакамітэта, прысвечанага 20-годдзю рэвалюцыі 1905 года.

УСМІХНЕМСЯ

Дзве сяброўкі.

— Вось хачу заўтра з Вовам на паказ мод схадзіць. Няхай падумае пра новую сукенку для мяне.

— Вой, Ганна! Гэта ты там падумаеш пра новую сукенку, а ён падумае пра новую жонку!

— Дарагі, я табе кашу зварыла, будзеш?

— Разумнічка, буду, а з чаго варыла?

— З пельменяў...

«АўтаВАЗ» стаміўся ад крытыкі і выпусціў канструктар «Зрабі сам» — зрабі сам, калі такі разумны.

Я паехаў у краму алкаголю ў пятніцу ўвечары на веласіпедзе, купіў бутэльку гарэлкі і паклаў яе ў свой веласіпедны кошык. Перад тым як ад'язджаць, я падумаў, што калі ўпаду з веласіпеда, бутэлька разаб'ецца. Таму я вырашыў выпіць усю бутэльку адразу, перад тым як паехаць дадому. І ведаеш, гэта было даволі правільнае рашэнне, таму што я падаў сем разоў па дарозе дадому.



Малюнак Пятра КОЗІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 301.

Нумар падпісаны ў 19.30 17 студзеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12